УДК 745/749:37.041-057.875БГУКИ

# ФАРМІРАВАННЕ ПРАФЕСІЙНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ ПРАЗ РЭАЛІЗАЦЫЮ СТУДЭНТАМІ ТВОРЧЫХ ПРАЕКТАЎ

***А. В. Шаціло,*** *старшы выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжана выкарыстанне праектных тэхналогій у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў кафедрай дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў». Адзначана, што ўдзел у творчых праектах з'яўляецца важным сродкам фарміравання прафесійных кампетэнцый, які можа значна павысіць эфектыўнасць навучання, даць неабходны вопыт, а таксама стаць шляхам да інтэграцыі ў прафесійную супольнасць, паколькі трансляцыя вынікаў сваёй працы, а менавіта ўдзел у мастацкіх выстаўках, з'яўляецца неад'емнай часткай дзейнасці мастака. Зроблена выснова, што фарміраванне прафесійных кампетэнцый шляхам рэалізацыі творчых праектаў і ўдзелу ў выставачнай дзейнасці з'яўляецца актуальным напрамкам у сучаснай мастацкай адукацыі.

**Ключавыя словы:** прафесійныя кампетэнцыі, мастацкая адукацыя, модульнае навучанне, прафесійная падрыхтоўка, кампетэнтнасны падыход, сістэмны падыход, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, самаадукацыя, метапрадметныя сувязі.

# FORMATION OF PROFESSIONAL COMPETENCIES THROUGH THE IMPLEMENTATION OF CREATIVE PROJECTS BY STUDENTS

***E. Shatilo,*** *Senior Lecturer of the Department of Decorative and Applied Arts of the Educational Institution «The Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article discusses the use of design technologies in the process of training specialists by the Department of Decorative and Applied Arts of Belarusian State University of Culture and Arts. The author notes that participation in creative projects is an important means of forming professional competencies, which can significantly increase the effectiveness of training, give the necessary experience, and also become a way of

integration into the professional community, since broadcasting the results of their work, namely participation in art exhibitions is an integral part of the artist's activity. As a result, the author comes to the conclusion that the formation of professional competencies through the implementation of creative projects and participation in exhibition activities is an urgent direction in modern art education.

**Keywords:** processional competencies, art education, modular training, professional training, competence approach, system approach, decorative and applied art, self-education, meta-subject relations.

Сучасныя трансфармацыі ў галіне мастацкай адукацыі, хуткі рост і ўкараненне інфармацыйных тэхналогій, пераход да модульнага навучання патрабуюць пераасэнсавання тэхналогій навучання і праектнай дзейнасці ў працэсе прафесійнай падрыхтоўкі. Зараз стаў дамініраваць асабова-арыентаваны падыход пры фарміраванні агульных і прафесійных кампетэнцый студэнтаў. Актуальная прафесійная адукацыя разглядае авалоданне кампетэнцыямі праз практычную дзейнасць як фактар паспяховай сацыяльнай і прамысловай інтэграцыі, канкурэнтназдольнасці, а таксама прафесійнай мабільнасці. Таму мэтай кампетэнтнастнага падыхода з'яўляецца не толькі перадача ведаў, уменняў і навыкаў, а таксама шматаспектнае развіццё асобы, магчымасць бачання прафесійных перспектыў, пашырэння міждысцыплінарных сувязей, схільнасці да індывідуальных творчых рашэнняў, самастойнай працы.

Навучанне на аснове фарміравання кампетэнцый мае асабовую накіраванасць, ажыццяўляецца ў працэсе практычнай дзейнасці з выкарыстаннем мінулага вопыта і заснавана на комплексным сістэмным падыходзе, накіраваным на авалоданне кампетэнцыямі, якія ўяўляюць спалучэнне прафесійных і асабовых якасцей. Трэба таксама адзначыць складаную ўзаемасувязь прафесійнага і асабовага, якая складаецца з узаемасувязі ведаў, навыкаў, вопыта, адказнасці.

Набыццё практычнных навыкаў для стварэння твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з'яўляецца мэтай і прыарытэтам падрыхтоўкі студэнтаў па дысцыпліне модуля «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКМ. Менавіта таму выкарыстанне тэхналогіі праектнай дзейнасці і ўдзел у мастацкіх выстаўках з творчымі работамі з'яўляецца найбольш прадуктыўным і вонкава бачным вынікам стаўлення студэнта да сваёй будучай прафесіі. Асноўныя фактары стварэння і рэалізацыі творчых праектаў знаходзяцца ў цеснай узаемасувязі з самастойнай творчай актыўнасцю студэнтаў. Пры гэтым трэба адзначыць, што самастойнасць з'яўляецца адной з найважнейшых характарыстык асобы і адным з галоўных

крытэрыяў для вызначэння ўзроўня прафесійнай кваліфікацыі спецыяліста. Фарміраванне самастойнасці ў падрыхтоўцы асобы будучага спецыяліста з’яўляецца адной з актуальных задач прафесійнай падрыхтоўкі. Але самастойная творчая праца паспяхова толькі тады, калі студэнт засвоіў дастаткова ведаў і ўменняў. Таму творчая дзейнасць студэнта залежыць не толькі ад патрабаванняў праграмы, а галоўным чынам ад матывацыі прафесійнага роста і, калі студэнт уключаны ў прафесійную выставачную дзейнасць, ён асэнсоўвае мэты і вынікі сваёй працы. Тады ў яго фарміруецца неабходны прыярытэт развіцця творчых і прафесійных кампетэнцый, самааналізу і самаадукацыі.

Пры ўдзеле ў творчых праектах студэнты вучацца ўзаемадзейнічаць з канцэпцыямі і тэмамі, якія вызначаны звонку, што дае магчымасць выйсці за межы вучэбных заданняў, пашырыць свае кампетэнцыі ў межах прафесійнай дзейнасці, адвольна выкарыстоўваць веды не толькі ў галіне дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а таксама пашырыць міждысцыплінарныя сувязі па малюнку, жывапісу, скульптуры. Студэнты ўдасканальваюць свае веды ў такіх блізкіх да дэкарактыўна-прыкладнога мастацтва накірунках, як дызайн і арт-дызайн. Трэба адзначыць, што зараз у прафесійнай дзейнасці на першы план выходзяць кампетэнцыі мастака, ад якіх будзе залежыць формаўтварэнне і сэнс твора.

Такім чынам, мэту ўдзелу студэнтаў у творчых праектах можна вызначыць як стварэнне ўмоў для развіцця творчага патэнцыяла асобы, развіцця прафесійных навыкаў. Дадзены падыход мае акрэсленую практычную накіраванасць, якая вызначае логіку пабудовы матэрыяла навучальнага працэса і спрыяе фарміраванню і далейшаму развіццю ўніверсальных, спецыяльных і прафесійных кампетэнцый пры кагнітыўнай універсальнай навучальнай дзейнасці. А менавіта, пабудова разважанняў ад агульных законаў да прыватных з’яў і ў адваротным накірунку, ад прыватнага да агульнага, уменне будаваць разважанні на аснове параўнання аб’ектаў і вылучэння агульных прыкмет, вывучэнне розных аспектаў тэмы, вылучэнне сэнсавых дамінант. Пры гэтым вырашаюцца наступныя задачы. Па-першае, навучальныя: набыццё ведаў, уменняў і навыкаў працы ў розных відах дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, практычных уменняў стварэння дэкаратыўных твораў, навык і вопыт удзелу ў розных мастацкіх выстаўках. З іх вынікаюць прафесійныя: стварэнне творчых праектаў ад вылучэння тэмы, ад ідэі і першых эскізаў да распрацоўкі тэхналогіі і выканання ў матэрыяле. Працаваць у абраных тэхніках дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і вылучаць лепшыя мастацкія рашэнні, развіваць вобразнае мысленне, умець ажыццяўляць свае задумкі, творча падыходзіць да пастаўленых задач. Гэта стымулюе студэнтаў да атрымання спецыяльных ведаў, дапамагае фарміраваць творчую асобу

мастака, спрыяе развіццю прафесійных кампетэнцый і практычнаму падыходу да прафесійнай дзейнасці.

Па-другое, выхаваўчыя, што дазваляе вылучыць зацікаўленых студэнтаў, якія больш схільныя да самастойнай творчай дзейнасці, дапамагчы ім у фарміраванні ўстойлівай зацікаўленасці ў прафесійнай творчай рэалізацыі, развіваць цікаўнасць да роднай культуры і мастацтва, выхоўваць у асобы лагічнасць, аналітычнае і крытычнае мысленне, а таксама мастацкае мысленне і ўяўленне.

Асабовымі вынікамі рэалізацыі творчых праектаў з'яўляюцца здольнасць і практычная магчымасць студэнтаў да самаадукацыі, высокая матываванасць да рэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці, фарміраванне адэкватнай самаацэнкі, заснаванай на паспяховасці такой дзейнасці, праз параўнанне сябе з іншымі ў прафесійным асяроддзі. Развіццё навыкаў супрацоўніцтва ў розных выпадках і сітуацыях, здольнасць ствараць прагназуема пазітыўныя вынікі, а не канфлікты, і знаходзіць вырашэнні ў спрэчных момантах.

Па-трэцяе, неабходна адзначыць вельмі важныя метапрадметныя вынікі такой працы. Да іх можна аднесці навык распрацоўкі спосабаў вырашэння праблем творчага кшталту ў розных памежных сітуацыях, фарміраванне навыкаў вылучэння мэты стварэння творчай работы, пастаноўкі задач з улікам зменлівасці сітуацыі і шляху планавання дасягнення канчатковых вынікаў.

Так, спецыфіка фарміравання прафесійных кампетэнцый ва ўмовах модульнага навучання накіравана на выкарыстанне ў навучальным працэсе актыўных праектна-даследавальніцкіх форм і метадаў навучання, што забяспечвае авалоданне студэнтамі не толькі тэарэтычнымі ведамі, але і спосабамі прафесійнага мыслення, а таксама стымулюе развіццё прафесійных навыкаў і прафесійную самаадукацыю.

Актыўнае выкарыстанне праетнай тэхналогіі садзейнічае фарміраванню прафесійных і культурных кампетэнцый студэнтаў, пашырэнню метапрадметных сувязей, развіццю асацыятыўнага, вобразнага і крытычнага мыслення, набыццю асабовага мастацка-творчага вопыта, а таксама пабудове стратэгіі асабістага творчага шляха і развіцця.

Пры аналізе выкарыстання праектных тэхналогій у працэсе падрыхтоўкі спецыялістаў кафедрай дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва БДУКМ можна зрабіць выснову, што фарміраванне прафесійных кампетэнцый шляхам рэалізацыі творчых праектаў і ўдзелу ў выставачнай дзейнасці з'яўляецца актуальным напрамкам у сучаснай мастацкай адукацыі. Удзел у творчых праектах з'яўляецца важным сродкам фарміравання прафесійных кампетэнцый, які можа значна павысіць эфектыўнасць навучання, даць неабходны вопыт, а таксама стаць шляхам да інтэграцыі ў прафесійную супольнасць, паколькі трансляцыя вынікаў сваёй працы, а менавіта ўдзел у мастацкіх

выстаўках, з’яўляецца неад’емнай часткай дзейнасці мастака. Такім чынам студэнты атрымліваюць першыя навыкі пастаноўкі мэты, тактыкі і стратэгіі атрымання канчатковых вынікаў, практычнай рэалізацыі задуманага, а потым дэманстрацыі гэтага на публіку, што значна павышае гатоўнасць да жыцця ў прафесійным свеце.